Пролетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

ВОЛЬНАЯ ПРАЦА

Орган Беластоцкага абкома і гаркома КП(б)Б і аблвыканкома.

Год выдання другі.

№ 51 (120) НЯДЗЕЛЯ 3 САКАВІКА 1940 г.

Цана 10 капеек

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

БЕРАЖЛІВА І ЛЮБОЎНА ВЫРОШЧВАЦЬ КАДРЫ

З кожным днём расце і умацоўваецца соцыялістычная гаспадарка ў заходніх абласцях Беларусі. Расце колькасць рабочых на прадпрыемствах. Павялічваецца прадукцыйнасць працы. Растуць культурныя запатрабаванні рабочага класа і сялянства.

Для кіраўніцтва соцыялістычнай гаспадаркай патрэбны кадры работнікаў. Партыйнымі, совецкімі, прафсаюзнымі і гаспадарчымі арганізацыямі вобласці за прайшоўшыя 5 месяцаў вылучана на кіруючую работу не мала чэсных, адданых соцыялістычнай радзіме мясцовых работнікаў.

Тав. С. Прытыцкі вылучан намеснікам старшыні аблвыканкома. Ткач тав. В. Пырко зараз кіруе абласным камітэтам прафсаюза шарсцянікаў. Тэкстыльшчыца тав. Е. Каплан вылучана дырэктарам фабрыкі № 25. Тав. З. Каеўскі, рабочы з 30-гадовым вытворчым стажам, вылучан начальнікам цэха 5 га тэкстыльнага камбіната. Ткач тав. Гнядэк вылучан намеснікам старшыні горвыканкома. Сотні таленавітых і здольных, прыгнечаных раней людзей, прышлі да кіраўніцтва прамысловасцю, прафсаюзнай і совецкай работай. У большасці ўсе яны паспяхова спраўляюцца з даручанай справай.

У справе падрыхтоўкі кадраў праароблена значная работа. Праз курсы вясковага актыва прапушчана 552 чалавекі, 108 нізавых прафсаюзных работнікаў скончылі курсы прафактыва. Праведзены курсы гандлёвых работнікаў, курсы гаспадарнікаў пры тэкстыльным трэсце.

Але гэта яшчэ не вырашае справы. Патрэба ў кадрах расце. Арганізаваныя па абласці раёны патрабуюць многа ліків кадраў на совецкую, прафсаюзную, гаспадарчую і гандлёвую работы. Патрэбу ў кадрах можна задаволіць толькі пры ўмове вылучэння соцень новых работнікаў з ліку перадавых рабочых і сялян, праявіўшых сябе ў барацьбе за справу партыі Леніна—Сталіна. Іх патрэбна будзе падрыхтаваць, навучыць асновам совецкай, прафсаюзнай і гаспадарчай работы.

Пара пакончыць з размовамі аб недахопе работнікаў і больш рашуча вылучаць кадры з ліку правераных на справе, адданых совецкай уладзе мясцовых людзей. Такіх нямала ў нашай вобласці. Яны праявілі сябе ў часы выбараў дэпутатаў Народнага Сабрання Заходняй Беларусі. Яны выяўляюцца зараз у час падрыхтоўкі да выбараў дэпутатаў у Вярхоўныя Советы СССР і БССР. Задача заключаецца ў тым, каб гэтых людзей далучыць да пастаяннай дзяржаўнай і грамадскай работы. Няма сумнення, што сярод іх нямала таленавітых, здольных арганізатараў, якія з поспехам справяцца з любой работай.

У справе вылучэння на кіруючую работу новых работнікаў да гэтага часу мае месца самацёк і бяздзейнасць. У апаратах фінансавага і зямельнага аддзелаў вобласці, у Дзяржбанку і некаторых іншых установах да гэтага часу няма ні воднага вылучэнца. Асобныя ўстановы ўкамплектаваліся за лік людзей, якія іменавалі сябе „спецыялістамі." Гэта прывяло да засмечанасці варожымі і неправеранымі людзьмі дзяржаўных апаратаў. Гэта мае месца асабліва ў апаратах Горхарчпрамгандлю і Рыбзбыту.

Неабходна адкінуць, як нягодную, тэорыю аб тым, што на ўсякую работу, нават нарыхтоўшчыкам, патрэбна пасылаць комуністаў. На многія адказныя работы можна і патрэбна вылучаць беспартыйных бальшавікоў, якія сваёй чэснай работай на блага радзімы паказалі адданасць справе соцыялізма.

Асаблівай увагі заслугоўвае пытанне вылучэння на кіруючую работу беларусаў, якіх польскія паны дзесяткі год трымалі ў поўным бяспраўі. Неабходна дабіцца павелічэння ліку беларусаў на кіруючых пасадах у совецкіх установах.

Неабходная дапамога і выхаванне вылучаных кадраў яшчэ недастаткова наладжаны. Тэкстыльны трэст, у якім налічваецца 355 вылучэнцаў, дырэктараў фабрык, начальнікаў цэхаў і іншых, ні разу не склікаў нарады, на якой-бы вылучэнцы змаглі падзяліцца вопытам сваёй работы. Такое-ж становішча ў абласным кіраўніцтве мясцовай прамысловасці. З гэтым нельга мірыцца. Работа з вылучэнцамі, штодзённыя клопаты аб іх выхаванні і ўздыме іх культурна-палітычнага і тэхнічнага ўзроўню з'яўляецца пастаяннай задачай кіраўнікоў прадпрыемстваў, партыйных, прафсаюзных і камсамольскіх арганізацый.

Беражліва і любоўна вырошчваць кадры работнікаў вучыць нас таварыш Сталін. Выконваючы яго ўказанні, клапатліва выхоўваючы патрэбных работнікаў, мы забяспечым новыя перамогі соцыялістычнага будаўніцтва.

—«о»—

У чэсць гадавіны з дня адчынення XVIII з'езда ВКП(б)

Да знамянальнай гадавіны з дня адчынення XVIII гістарычнага з'езда ВКП(б) — 10 сакавіка калектыў Маскоўскага завода «Красный пролетарий» — ініцыятар соцыялістычнага спаборніцтва імені 3-ій сталінскай пяцігодкі — прышоў з вялікай вытворчай перамогай. Выканаўшы студзеньскі план на 109%, чырвонапролетарцы далі ў лютым 115% праграмы. (ТАСС).

ПРАСЛЕДВАННЕ КОМУНІСТАЎ ВА ФРАНЦЫІ

Брусель, 2 сакавіка. (ТАСС). Бельгійская газета „Дэрн'ерэр" у паведамленні свайго парыжскага карэспандэнта ўказвае, што ў Арасе (Францыя) сакратар прафсаюза чыгуначнікаў Дэлуазон і казначэй Крамер прыгавораны да аднаго года шасці месяцаў пазбаўлення волі і грашовага штрафу. Абодва яны абвінавачваюцца ў „комуністычнай прапагандзе".

АПЕРЗВОДКА ШТАБА ЛЕНІНГРАДСКАЙ ВАЕННАЙ АКРУГІ

На працягу 29 лютага на Карэльскім перашэйку наступленне нашых часцей працягвала паспяхова развівацца. Нашы часці захапілі чыгуначную лінію **Выбарг—Валкярві**, занялі станцыі **Йоряпяя, Хейньокі, Пэро** (у 9 кіламетрах на ўсход ад Выбарга), а таксама мястэчка **Аласяніо** і дачы на ўсходнім беразе Выбаргскага заліва, што ў двух кіламетрах на поўдзень ад Выбарга.

Нашымі часцямі за 28 і 29 лютага занята 270 абарончых умацаваных пунктаў праціўніка, з іх 66 жалезабетонных артылерыйскіх збудаванняў, звыш 42 абарончых умацаваных пунктаў, указаных у зводцы за 28 лютага.

На астатніх участках фронта без істотных перамен.

Наша авіяцыя вяла актыўныя дзеянні па войсках і ваенных аб'ектах праціўніка. На аэрадромах праціўніка і ў паветраных баях знішчана 36 самалётаў праціўніка.

АПЕРЗВОДКА ШТАБА ЛЕНІНГРАДСКАЙ ВАЕННАЙ АКРУГІ

На працягу 1 сакавіка на Карэльскім перашэйку наступленне нашых часцей працягвала паспяхова развівацца. Нашы часці занялі: раён вадаспада Пааккола-Коскі на рацэ Вуоксі, горад **Хэйньокі**, мястэчка **Маннікала**, станцыю **Талі** (на чыгунцы Выбарг — Сердабаль), паўднёвую ўскраіну горада **Выбарга** і мыс **Кейкхяніемі** на заходнім узбярэжжы Выбаргскага заліва.

Праціўнік падпальвае горад Выбарг.

За перыяд з 11 лютага па 1 сакавіка нашымі часцямі захоплена 922 абарончых умацаваных пунктаў праціўніка, з іх — 235 жалезабетонных артылерыйскіх збудаванняў, пры гэтым страты праціўніка складаюць: 506 гармат, 2732 кулямёты, 19 танкаў, 20.000 снарадаў, 10.000 вінтовак і звыш 14 мільёнаў патронаў.

На астатніх участках фронта не адбылося нічога істотнага.

Наша авіяцыя вяла актыўныя дзеянні па войсках і ваенных аб'ектах праціўніка. У завязаўшыхся паветраных баях збіта 11 самалётаў праціўніка.

Усяго за перыяд з 11 лютага па 1 сакавіка ўключна збіт 191 самалёт праціўніка. За той-жа перыяд наша авіяцыя страціла ўсяго 21 самалёт.

Замежны друк аб поспехах Чырвонай Арміі ў Фінляндыі

Хельсінскі карэспандэнт амерыканскай газеты «Нью-Йорк таймс» заяўляе, што прасоўванне совецкіх войск вымушае фінаў здаваць свае самыя моцныя пазіцыі. Націск часцей Чырвонай Арміі працягвае нарастаць. Па думцы ваенных аглядальнікаў, піша карэспандэнт, наступіў рашаючы момант ваенных дзеянняў. «Фіны, — піша ён далей, — лічаць склаўшаеся становішча вельмі сур'ёзным. Яны ўпершыню адступаюць у сярэднай частцы лініі Манергейма. Відавочна, яны адступяць на новыя пазіцыі на паўнач ад Выбарга, якія аднак слабей у практычных адносінах, чым лінія Манергейма».

Дацкія газеты пад вялікімі загалоўкамі змяшчаюць паведамленне аб перамогах совецкіх войск на Выбаргскім напрамку. Спецыяльны карэспандэнт капенгагенскай газеты «Нацыянальтыдэндэ» піша, што для фінаў склалася вельмі сур'ёзная абстаноўка. Карэспандэнт падкрэслівае, што «совецкія войскі прымяняюць самую ўдасканаленую зброю і вядуць наступленне, якога яшчэ не ведала сусветная гісторыя». (ТАСС).

У АБКОМЕ КП(б)Б

Днямі бюро абкома КП(б)Б заслухала справаздачу Беластоцкага гаркома партыі аб разгортванні агітацыйна-масавай работы ў сувязі з выбарчай кампаніяй.

Бюро абкома адзначыла, што гарком КП(б)Б пасля правядзення вялікай работы ў сувязі з вылучэннем кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўных Советаў СССР і БССР, падборам агітатараў, арганізацыяй гурткоў выбаршчыкаў і правядзеннем іншай масавай работы, зараз аслабіў увагу, забыўшы аб тым, што палітычны поспех выбараў рашае агітацыйная работа на участках.

У выніку гэтага ў горадзе ёсць выбарчыя участкі (55, 58), якія да гэтага часу дрэнна афармлены і нават зусім не афармлены. Складанне і праверка спіскаў выбаршчыкаў па гораду яшчэ не скончана і не ўдакладнены граніцы некаторых выбарчых акруг і участкаў (Палеская вуліца). На многіх участках не арганізаваны дзяжурствы членаў камісій, адсутнічаюць сталы даведак, асобныя участкі яшчэ не сталі цэнтрам агітацыйна-масавай работы.

Недастаткова разгорнута работа з агітатарамі, у некаторых выбарчых акругах не праводзяцца інструкцыйныя нарады і семінары. Выдзеленыя асобнымі партарганізацыямі (пракуратура) агітатары не прыступілі да работы. Не склікаліся нарады даверанных і не кантралявалася іх работа.

Бюро абкома абавязала гарком КП(б)Б і пярвічныя партыйныя арганізацыі накіраваць усю ўвагу на дапамогу выбарчым акругам і ўчасткам у разгортванні агітацыйна-масавай работы.

Неабходна праводзіць нарады даверанных па выбарчых акругах сумесна з старшынямі акруговых і ўчастковых выбарчых камісій. Разгортваючы і надалей работу гурткоў па вывучэнню Канстытуцыі, выбарчага закона і біяграфій кандыдатаў, усямерна пашыраць індывідуальную агітацыю на кватэрах у выбаршчыкаў. Удакладненне спіскаў выбаршчыкаў і афармленне выбарчых участкаў павінна быць выканана безадкладна.

Бюро абкома ўказала на вялікае значэнне арганізацыі насценгазет на выбарчых участках. Цэнтр сваёй работы ўсе партыйныя арганізацыі павінны перанесці зараз на выбарчыя ўчасткі.

Сустрэча кандыдата ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР Абрама Гешэлевіча Машэвіцкага з выбаршчыкамі

29 лютага ў абласным Доме партыйнай асветы адбылася сустрэча сямісот маладых выбаршчыкаў Совецкай акругі з кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР Абрамам Гешэлевічам Машэвіцкім.

З вялікім парывам пад доўгія несціханыя апладысменты і воклічы „ура" ўдзельнікі аднадушна выбралі ў пачотны прэзідыум Палітбюро ЦК ВКП(б) на чале з геніяльным правадыром працоўных усяго свету таварышам Сталіным.

На сходзе з прамовай выступіў кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР Абрам Гешэлевіч Машэвіцкі. Паяўленне на трыбуне Абрама Гешэлевіча цёпла сустрэлі прысутныя.

Прамова тав. Машэвіцкага

Таварышы! Перш за ўсё дазвольце мне выказаць вам глыбокую падзяку за высокую чэсць і давер'е, якое вы аказалі мне, вылучыўшы кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР.

Падобна сотням тысяч працоўных, я многа ўжо пражыў і перажыў, але сапраўднае маё жыццё пачалося зусім нядаўна. Яно пачалося ў той гістарычны час, калі доблесная Чырвоная Армія, пасланая воляй совецкага ўрада і партыі Леніна—Сталіна, скінула ў памыйную яму ўвесь панска шляхецкі зброд. Толькі цяпер я адчуў усё хараство свабоднага, шчаслівага жыцця.

На нашых вачах адбываюцца небывалыя і вялікія змены. Фабрыкі, заводы, якія раней сталі, зараз працуюць на поўным хаду. Ліквідуецца беспрацоўе, арганізоўваюцца сотні школ і бальніц і, самае галоўнае, мы самі будуем сваё новае жыццё.

З першых дзён совецкай улады з усёй сваёй энергіяй і сілай я актыўна ўдзельнічаю ў соцыялістычным будаўніцтве. Надалей я таксама буду працаваць, наколькі хопіць сіл і здольнасцей, на карысць працоўнага народа.

Перад намі стаіць вялікая задача. Патрэбна асаблівая класавая пільнасць. Вораг прытаіўся і будзе прабаваць пашкодзіць соцыялістычнаму будаўніцтву. Прадстаіць упартая барацьба са спекулянтамі і іншымі непрацоўнымі элементамі. Трэба наўхільна павышаць прадукцыйнасць працы, клапаціцца аб культурным будаўніцтве гарадоў і вёсак. У бліжэйшы час трэба вырашыць жыллёвае пытанне.

Спадзяюся, што з вашай дапамогай, пад кіраўніцтвам вялікай комуністычнай партыі здолею з чэсцю выканаць абавязкі дэпутата і апраўдаць давер'е выбаршчыкаў.

Няхай жыве вялікая комуністычная партыя бальшавікоў і геніяльны правадыр працоўных дарагі Іосіф Вісарыёнавіч Сталін!

Д. Казлоў

Сустрэча кандыдата ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР Дзмітрыя Сцяпанавіча Маўчанскага з выбаршчыкамі

Боцькі. (Наш спец. кар.) Больш 400 выбаршчыкаў мястэчка Боцькі сабраліся 28 лютага на сход, прысвечаны сустрэчы са сваім кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР Дзмітрыем Сцяпанавічам Маўчанскім. Зал ледзь змясціў усіх жадаючых. Старшыня сходу т. Юркевіч прадастаўляе слова тав. Маўчанскаму.

Прамова тав. Маўчанскага

Доўгія годы працоўныя Заходняй Беларусі былі заціснуты ў кіпцюры драпежнага польскага арла, якому Чырвоная Армія абламала крыллі. Больш 5 месяцаў тут над краінай палыхае сцяг соцыялізма. Народ, выпраміўшы свае гадамі сагнутыя спіны, горда заяўляе, што ён з'яўляецца сапраўдным гаспадаром вызваленай зямлі. Совецкая ўлада дала працоўным свабоду, зямлю, права на працу. Толькі па аднаму Бельскаму раёну ўстроена на работу больш 1500 чалавек. 2263 га зямлі раздана беззямельным і малазямельным сялянскім гаспадаркам. 144 сялянскія гаспадаркі атрымалі коней, 324 бескаровыя сялянскія гаспадаркі атрымалі кароў. Непараўнальна палепшылася медыцынскае абслугоўванне насельніцтва. Кожны сельсовет мае свой медпункт, некаторыя—нават амбулаторыі. У раёне адкрыты дзве новыя бальніцы, тубдыспансер і вендыспансер. 2094 дзяцей атрымалі магчымасць вучыцца. Адкрыта ў раёне 13 новых школ. Нам патрэбны культурныя, свядомыя будаўнікі комунізма.

Сяляне раду сельсоветаў вылучылі мяне кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР. Я выхадзец з беднай сялянскай сям'і, беларус. З малых год пачаў працаваць. Служыў у радах РСЧА, працаваў старшынёй сельсовета, быў на партыйнай рабоце. Зараз працую сакратаром Бельскага райкома партыі. Вось мая кароткая біяграфія, якая нічым не адрозніваецца ад біяграфій многіх другіх совецкіх грамадзян. І калі-б не совецкая ўлада, якая мяне выхавала, я-б вырас цёмным, непісьменным батраком. Таму ўсе свае сілы я аддам сваёй соцыялістычнай радзіме.

* * *

Хвалюючымі былі словы выбаршчыка Бакера: „У панскай Польшчы таксама былі выбары, — гаворыць ён. — Я добра памятаю, як да нас у Боцькі прыехаў якісьці чыноўнік, які заклікаў нас галасаваць за Месінга. Хто гэты Месінг, дзе ён знаходзіцца, мы нічога не ведалі. Гаварылі, што ён „рольнік"-селянін. Як потым мы даведаліся, гэты Месінг быў самым буйным памешчыкам, меў больш 2000 га зямлі, 100 коней і 200 кароў. Жыў ён у Варшаве.

А зараз перад намі выступаў сапраўдны народны кандыдат, аб якім мы многа чулі і чыталі. Кожны з нас з радасцю аддасць свой голас за народных прадстаўнікоў".

М. Шахновіч.

24 САКАВІКА ВЫБАРЫ Ў ВЯРХОЎНЫЯ СОВЕТЫ СССР І БССР

ВЫБАРШЧЫКІ 356 ВЫБАРЧАЙ АКРУГІ ПА ВЫБАРАХ У ВЯРХОЎНЫ СОВЕТ БССР, УСЕ, ЯК АДЗІН, АДДАВАЙЦЕ СВАЕ ГАЛАСЫ ЗА КАНДЫДАТА БЛОКА КОМУНІСТАЎ І БЕСПАРТЫЙНЫХ, ПЯТРА КІРЫЛАВІЧА ВАЙЦЭШУКА!

Пётр Кірылавіч Вайцэшук

(БІЯГРАФІЧНЫ НАРЫС)

Адкрыты твар, сярэдні рост, каранасты, у скромным касцюме совецкага чыгуначніка — такі знешні выгляд Пятра Кірылавіча Вайцэшука — кандыдата ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР.

34 гады, пражытыя ім, поўны лішэнняў. Маленькім дзіцём ён разам з сям'ёй уцякаў углыб Расіі ад жахаў сусветнай вайны, якая разыгралася ў 1914 годзе на яго радзіме — у заходніх абласцях Беларусі.

Жыццё ў дарэволюцыйнай Расіі многаму навучыла маладога Пятра. Асабліва памятны рэволюцыйныя дні ў Петраградзе ў кастрычніку 1917 года. 11-гадовы Пеця Вайцэшук жыў недалёка ад вялікага гаража і быў сведкай узброенага захвату яго паўстаўшымі рабочымі. Пеця са сваімі равеснікамі цэлымі днямі прападаў у гаражы, лічачы сваім доўгам праводзіць кожны натапырыўшыйся штыкамі грузавік, які адвозіў рабочых на апошні і рашучы бой.



У 1921 годзе бацька Вайцэшука пераехаў у Польшчу. Пецю споўнілася 15 год. Бацька заняўся апрацоўкай кавалачка зямлі, якім уладаў яшчэ да вайны. Пеця, не маючы ніякіх надзей працягваць вучобы ў школе, паступіў на чыгунку ў якасці рамонтнага рабочага.

З першых-жа дзён Вайцэшук падвяргаецца ўсялякім прыніжэнням і здзекам. У штат пастаянных рабочых яго адмовіліся залічыць. Беларус не мог разлічваць на такое «шчасце». На працягу доўгіх 18 год сваёй работы на транспарце аж да прыходу Чырвонай Арміі Вайцэшук так і не быў залічан у штат.

«Часовы рабочы» — гэта ў перакладзе на звычайную мову — пазбаўленне нават тых мізэрных правоў, якімі карысталіся чыгуначнікі.

«Часовы рабочы» — гэта паніжаная аплата працы, пастаянная пагроза звальнення па любому поваду і без усякага повода. Гэта Дамоклаў меч, які на працягу 18 год вісеў над галавой пролетарыя-беларуса.

Між іншым, Вайцэшук мог-бы пры некаторых умовах папасці ў лік пастаянных рабочых. Для гэтага патрабавалася нямнога, так «пустая фармальнасць» — трэба было перайсці ў «польскую веру» — прыняць каталіцтва.

— Падумай аб сабе і аб дзецях, — гаварыў Вайцэшуку «сам» начальнік станцыі Беласток - цэнтральная. — Дзеці твае, як беларусы, будуць пазбаўлены права на асвету. Яны вечна будуць у прыгнечанні.

— **Вечна?** — перапытаў, усміхнуўшыся, Вайцэшук:

— Так, вечна. Ці не спадзяешся ты на прыход комуністаў? — раптам падскочыўшы, запытаў начальнік. І, падняўшы палец, павучальна сказаў:

— Ведай і запомні, што большэвікі сюды ніколі не прыдуць. Ідзі і падумай добра аб тым, што я прапанаваў табе.

І Вайцэшук пайшоў. Пагроза звальнення і жахі беспрацоўя не зламалі яго волю. Ён любіў свой народ, верыў у яго несакрушальныя сілы.

Мізэрнымі і смешнымі здаваліся яму патугі польскіх паноў гвалтоўна апалячыць беларусаў — прывесці іх да «адзінай веры», зрабіць слугамі чорнага духавенства — верных халопаў капіталістаў і памешчыкаў.

У рэволюцыйных уражаннях дзяцінства чэрпаў рабочы Вайцэшук глыбокую веру ў вялікую совецкую краіну. Ён ведаў: рана ці позна, але дапамога прыдзе адтуль, з усхода, ад родных братоў па крыві. па класу. І ён не памыліўся.

Збылася заветная мара. Краіна соцыялізма працягнула брацкую руку дапамогі. Разам з усім народам заходніх абласцей роднай Беларусі, Вайцэшук стаў свабодным, раўнапраўным чалавекам. Па іншаму засвяціла сонца. Радасным стаў свет. Хочацца працаваць не пакладаючы рук, працаваць для сабе, на блага сваёй горача любімай радзімы.

Пры першых вестках аб набліжэнні Чырвонай Арміі труслівыя паны, як мышы, разбегліся з усіх камандных пастоў на транспарце. Уцякаючы, яны ламалі і псавалі ўсё, што было магчыма. Парушана была тэлефонна-тэлеграфная сувязь, не працавалі дэпо і майстэрні, саставан быў вадаправод. Нармальны рух паяздоў быў паралізаваны.

Пётр Вайцэшук першым прышоў на совецкую станцыю Беласток не як бяспраўны «часовы», а сапраўдным гаспадаром і энтузіястам. Ён прыняўся за аднаўленне парадку на чыгунцы. Чэснай работай ён заваяваў давер'е. Яго ставяць на самы адказны ўчастак — прапускаць вайсковыя эшалоны Чырвонай Арміі, і стрэлачнік Вайцэшук працуе на гэтым пасту чотка, без адзінай замінкі.

Вайцэшук уваходзіць у арганізацыйнае бюро па стварэнню прафесіянальнага саюза. На яго долю выпала чэсць адкрыць першы свабодны сход чыгуначнікаў. Ён гаворыць палкую прамову, поўную глыбокай любві і ўдзячнасці да вялікай партыі Леніна—Сталіна, да доблеснай Чырвонай Арміі, якая прынесла прыгнечаным масам радасць і шчасце.

Вайцэшук выказаў думы і пачуцці ўсіх рабочых. У замурзаных касцюмах, з забруджанымі маслам і сажай тварамі падыходзілі да яго качагары, машыністы і слесары, і мазолістымі рукамі пацiскалі руку Пятру Кірылавічу. Яны ўсхвалявана выказвалі яму поўную згоду і адабрэнне.

Першы профсаюзны сход аднагалосна выбраў Вайцэшука членам мясцовага камітэта профсаюза станцыі Беласток і дэлегатам на дарожную канферэнцыю.

Канферэнцыя выбрала Пятра Кірылавіча ў дарожны камітэт профсаюза — членам прэзідыума яго, а таксама дэлегатам на X Усесаюзны з'езд профсаюзаў СССР. Вайцэшук перайшоў на новую для яго работу — загадчыкам бытавога сектара дорпрофсожа.

Яго добрасумленная работа, уважлівасць і чуласць да людзей заваявалі яму любоў і павагу рабочых і служачых чыгункі. На сходзе Беластоцкага чыгуначнага вузла рабочыя і служачыя, інжынерна-тэхнічны персанал вылучылі кандыдатуру Пятра Кірылавіча Вайцэшука ў дэпутаты Вярхоўнага Совета Беларускай Рэспублікі.

Выступаўшыя на сходзе з цеплатой і павагай адзываліся аб рабоце Пятра Кірылавіча. Самая выдатная яго рыса — гэта любоўныя адносіны да людзей, да іх патрэб і запросаў.

Такі дэпутат, — гаварылі на сходзе, — будзе дастойным прадстаўніком чыгуначнікаў у соцыялістычным парламенце нашай ордэнаноснай рэспублікі.

П. Юрын.

АРГАНІЗОВАНА СУСТРЭЦЬ ДЗЕНЬ ВЫБАРАЎ

У СЛАБАДСКОЙ ВЫБАРЧАЙ АКРУЗЕ

У доме № 9 на Вясёлай вуліцы змяшчаецца акруговая выбарчая камісія Слабадской выбарчай акругі па выбарах дэпутатаў у Вярхоўны Совет БССР. У тым-жа доме знаходзіцца і выбарчы ўчастак № 87.

На ўчастку знаходзілася толькі што прышоўшая з фабрыкі тав. Маеўская, член участковай выбарчай камісіі. Яна расказала, што ўчастак ахапляе 10 вуліц з колькасцю выбаршчыкаў звыш 900. Калі мы гутарылі з тав. Маеўскай, на ўчастак прышло чалавек 10 агітатараў. Яны прасілі даць ім заданне. Але паколькі ні даверанага, ні старшыні, ні сакратара ўчастковай камісіі не было, агітатары задання не атрымалі.

Участак не забяспечан мясцовымі газетамі. Не хапае матэрыялу з біяграфіямі кандыдатаў у дэпутаты, што тармозіць разгортванне агітацыі за кандыдатаў.

Наведванне кватэр выбаршчыкаў паказала, што агітатары ахвотна наведваюць насельніцтва. Выбаршчыкі, якія жывуць у доме № 8 па Вясёлай вуліцы, займаюцца ў гуртку пры ўчастковай выбарчай камісіі. Аб задаволенні работай гуртка сведчыць заява аднаго маладога выбаршчыка.

— Новы свет адкрываецца перад намі, — гаворыць ён. — Мы да гэтага часу вельмі мала ведалі аб тым, як жывуць працоўныя ў вялікім Совецкім Саюзе. Цяпер нам расказваюць аб жыцці працоўных СССР і аб той гіганцкай рабоце, якую прарабілі народы Совецкага Саюза, каб дабіцца шчаслівага жыцця.

Бемаў.



На здымку: заняткі па вывучэнню Сталінскай Канстытуцыі на плюшавай фабрыцы № 31 у Беластоку. Злева: кіраўнік гуртка, агітатар - комсамолка тав. Зіна Брэніна. (Фота-клішэ ТАСС).

ЧЫРВОНЫЯ АБОЗЫ Ў ЧЭСЦЬ ВЫБАРАЎ

Монькі. (Па тэлефону). У раёне створаны сотні гурткоў, у якіх выбаршчыкі вывучаюць даклад таварыша Сталіна на Надзвычайным VIII Усесаюзным з'ездзе Советаў, Сталінскую Канстытуцыю, Палажэнне аб выбарах і біяграфіі лепшых сыноў і дачок совецкага народа, вылучаных кандыдатамі ў дэпутаты Вярхоўных Советаў СССР і БССР.

Каля 500 агітатараў працуюць у раёне. Арганізоўваюцца лыжныя агітпаходы. З вялікай актыўнасцю праходзяць сходы сялян, інтэлігенцыі, моладзі. З уздымам сяляне, атрымаўшыя памешчыцкую зямлю, рыхтуюцца да першай совецкай вясны.

Выбарчую кампанію сяляне Монькаўскага раёна знамянуюць працоўным уздымам на загатоўках і вывазцы лесаматэрыялаў, арганізаваным продажам дзяржаве хлеба, мяса, скурсыравіны.

Сяляне вёскі Ясінаўка і навакольных вёсак — Сламянка, Каменка, Ясінавечка і іншых — у чэсць усенароднага свята — дня выбараў — арганізавалі 28 і 29 лютага чырвоныя абозы з хлебам і мясам. Яны прадалі дзяржаве 16.400 кг. (1.025 пудоў) хлеба і 4.125 кг. (260 пудоў) мяса. Працоўныя вызваленых сёл вядуць барацьбу за дастойную сустрэчу дня выбараў 24 сакавіка, за ператварэнне Монькаўскага раёна ў перадавы раён вобласці.

П. Гараінаў.

На 84-ым выбарчым участку

84 выбарчы ўчастак дзейна рыхтуецца да дня выбараў у Вярхоўныя Советы СССР і БССР.

На ўчастку арганізавана 15 гурткоў выбаршчыкаў. У гуртках 29 груп. Імі ахоплена 523 выбаршчыкі. Акрамя гэтага, індывідуальнай вучобай ахоплена 180 чалавек.

Усе вуліцы падзелены паміж агітатарамі, якія праводзяць работу ў асобных дамах. Акрамя агітатараў, на ўчастках працуе больш 30 актывістаў, якія дапамагаюць агітатарам.

Кожны дзень на выбарчым участку многа людзей. Яны прыходзяць сюды пачытаць літаратуру, газеты, пагутарыць з дзяжурным па ўчастку.

Даверанны 84 выбарчага ўчастка
І. Біскін.

БЕЛАСТОЦКАЯ ВЁСКА ПЕРАД СЯЎБОЙ

Пасля бесперапынных траскучых марозаў у Беластоцкай абласці наступіла пацяпленне. Прыгравае сонца. Слупок ртуці на тэрмометры ўзнімаецца вышэй нуля. Усё напамінае аб набліжэнні вясны. Для заходніх абласцей БССР яна будзе першай большэвіцкай вясной.

Беластоцкай абласці прадстаіць засеяць у гэтым годзе 986 тысяч гектараў, з іх 402 тысячы азімых.

У абласці ствараецца 24 машынна-трактарных станцый. У Дайлідах — прадмесці Беластока — арганізуецца машынна-трактарная майстэрня. Кожная МТС атрымае сем-дзесяць трактараў, якія выдзяляюцца трактарнымі станцыямі ўсходніх абласцей Беларусі.

У Валкавыску пачалі работу двухмесячныя абласныя курсы трактарыстаў, разлічаныя на 170 чалавек. Курсанты адбіраліся райкомамі партыі з бядняцкай, батрацкай моладзі. Акрамя таго, абласць пасылае 220 чалавек на курсы трактарыстаў і камбайнераў у Бабруйск. Сваю дзейнасць новыя МТС пачнуць у некалькі незвычайных умовах. Не выключана, што некаторым з іх у першыя часы прыдзецца абслугоўваць таксама індывідуальныя гаспадаркі. Цяжка загадзя ўгадаць, якія формы прыме гэта дапамога соцыялістычнай дзяржавы сялянам - аднаасобнікам. Магчыма, уласнікі змежных участкаў будуць дагаварвацца паміж сабой аб сумесным скарыстанні трактара і т. д. Але ўжо загадзя можна сказаць, што трактар наглядна пакажа перавагу буйнай машынізаванай гаспадаркі і будзе спрыяць перамаганню ўласніцкіх прадрассудкаў.

Ужо і цяпер амаль у кожным раёне можна сустрэць сялян-беднякоў, батракоў і серадняков — энтузіястаў і застрэльшчыкаў калектыўнай гаспадаркі. З вёсак у райкомы партыі прыходзяць хадакі, каб прасіць дапамогі ім арганізаваць калгас. У вёсках Студзянка, Беластоцкага раёна, «Новая воля», Заблудаўскага раёна, калгасы ўжо арганізаваны і рыхтуюцца да вясенняй сяўбы.

Раённыя камітэты партыі паступаюць правільна, калі, перш чым ухваліць ініцыятыву сялян, старанна правяраюць кожную заяву. Кулакі не прэч спрыяць стварэнню скараспелых, непадрыхтаваных калгасаў, каб тым самым скампраментаваць у вачах сялян ідэю калектывізацыі. Кулак ахвотна падаграваe ўтрыманцкія настроі малаўстойлівай часткі насельніцтва. Ён паказвае справу так, быццам дастаткова запісацца ў калгас — і дзяржава дасць табе ўсё гатовенькае: і машыны, і жывёлу, і хлеб, і грошы, а калгасніку астаецца толькі пашырэй разяваць рот.

Таму трэба мацней вока аберагаць ініцыятыву чэсных, перадавых сялян ад кулацкіх прошукаў, а ўтвараючыяся калгасы — ад пранікнення ў іх кулакоў і падкулачнікаў. Трэба расказаць сялянам праўду аб калгасах, азнаёміць іх з статутам сельгасарцелі, перасцерагчы ад лёгкадумных, неабдуманых дзеянняў.

Некаторыя комуністы замест таго, каб грунтоўна пагаварыць з кожнай групай сялян, якія імкнуцца ў калгас, і па-сапраўднаму дапамагчы ім, страхуюцца, баяцца адказнасці, адмахваюцца ад хадакоў, не гавораць ім ні так, ні не. І часам сяляне, не атрымаўшы своечасова парады, пачынаюць дзейнічаць па ўласнаму ўгледжанню, іншы раз ураз рэз з статутам сельгасарцелі.

Пасеяць трэба чыстым, адборным зярном. Але ачыстка насення арганізавана ў Беластоцкай абласці дрэнна. Тут ёсць 314 трыераў, 280 сартыровак, 605 веялак, што асталіся ад памешчыкаў і пракатных пунктаў розных таварыстваў. Далёка не ўсе гэтыя машыны скарыстоўваюцца. Сто пяць зернаачышчальных абозаў павінны рухацца па пэўных маршрутах і абслугоўваць у шляху дзяржаўныя склады, сялянскае насельніцтва. Абозы існуюць ужо месяц, але ніхто ў абласным зямельным аддзеле не ведае, дзе яны знаходзяцца, што робяць, колькі зярна ачысцілі. К таму і сяляне не прывыклі карыстацца зернаачышчальнымі машынамі, лічаць ачыстку насення залішняй.

Беластоцкі абком КП(б)Б абавязаў райкомы арганізаваць дадаткова новыя абозы. Прапанавана таксама стварыць грамадскія кузні для рамонту інвентару, скарыстаць прыватныя кузні. Мяркуецца паслаць у вёскі брыгады рымараў для папраўкі збруі, наладзіць выпуск калёсных абадоў, трубак, спіц.

На жаль, у рашэннях абкома нічога не гаворыцца аб мабілізацыі сялянскіх мас, не гаворыцца аб тым, што задачы вясенняй пасеўнай кампаніі павінны быць шырока растлумачаны насельніцтву.

І ў абкоме, і ў раёнах існуе чамусьці думка, быццам кіраўніцтва індывідуальнымі гаспадаркамі не ўваходзіць у задачу партыйных і зямельных органаў.

Разумеецца, кіраваць сельскай гаспадаркай дзе-небудзь у Магілеўскай, напрыклад, абласці і мець справу толькі з буйнымі соцыялістычнымі гаспадаркамі прасцей, лягчэй, чымся зрабіць уплыў на сотні тысяч аднаасобнікаў. Але і ва ўмовах Беластоцкай абласці можна і трэба дабіцца, каб сяляне ачысцілі насенне, праверылі яго ўсхожасць, пасеялі ў сціслыя тэрміны, наладзіць дапамогу бясконным і т. д.

Трэба не размаўляць аб тым, што абласць — спажывецкая, а дапамагчы аднаасобніку і кіраваць ім. І ў выніку краіна атрымае дадатковыя тысячы тон хлеба.

П. Лідаў
(«Праўда»).

МІЖНАРОДНЫ ХАРАКТАР ФІНЛЯНДСКІХ ПАДЗЕЙ

Палкавы камісар А. ГАЛІН

Вось ужо амаль тры месяцы, як у цэнтры ўвагі ўсяго свету стаіць фінляндскае пытанне. Чытаючы французскія, англійскія, амерыканскія і скандынаўскія газеты, здаецца, што нават вайна паміж Германіяй, з аднаго боку, і Францыяй і Англіяй — з другога, адышла на задні план, што нават няма ніякай вайны паміж Кітаем і Японіяй, што няма ніякага вострага канфлікту паміж Японіяй і Злучанымі Штатамі, а ёсць толькі «мужная», «прагрэсіўная», «соцыяльная фінская дэмакратыя» і «савецкія варвары», якія хочуць з самых чорных пабуджэнняў знішчыць гэту «выдатную перадавую дэмакратыю свету».

Вакол Фінляндыі сусветная буржуазія і соцыял-дэмакратычная прэса, — і тую і другую можна назваць жоўтай, — склала легенды, апокрыфічныя сказанні. Аказваецца, кожны дзень фіны атрымліваюць патрасаючыя перамогі, а СССР церпіць сакрушальныя паражэнні. Англійскія кансерватары і лейбарысты, амерыканскія дэмакраты і рэспубліканцы, соцыялісты ўсіх масцей, Троцкі і другія белыя эмігранты, каралькі і прэзідэнты, папа рымскі і іншыя князі ўсіх цэркваў, квакеры і рэнегаты, паліцэйскія, шпіёны і прастытуткі з тратуараў і з газетных рэдакцый — усе яны аб'ядналіся ў «свяшчэнным» паходзе супроць Савецкага Саюза, у абарону «ні ў чым не павіннай паўночнай Аркадзіі».

З усіх шчылін і падваротняў вылезлі ворагі Савецкага Саюза. Пад шум абароны Фінляндыі сучасныя «перадавыя дэмакратыі» — Англія, Францыя, Швецыя, Швейцарыя і Злучаныя Штаты абрушыліся на рабочы клас і раней за ўсё на комуністычныя партыі. Скасоўваюцца ўсе і без таго куцыя свабоды, падаўжаецца рабочы дзень, змяншаецца заработная плата, і ўсё гэта ў імя абароны дэмакратыі. Пушчаны ў ход грандыёзныя фабрыкі хлусні і паклёпу. Тэлеграфныя агенцтвы і буйныя газеты, якія шчагалялі сваім «аб'ектывізмам», сталі пастаўшчыкамі самых непраўдападобных, фантастычных чутак, бязглуздых выдумак, бессаромнай хлусні.

Калі знаёмішся з гэтым патокам хлусні і паклёпу, калі чуеш вой і віскатню ўсіх гэтых машэннікаў пяра і бандытаў друку супроць СССР, мімаволі ўспамінаеш Пушкіна:

Сколько их! куда их гонят?
Что так жалобно поют?
Домового ли хоронят,
Ведьму ль замуж выдают?

Для таго, каб зразумець усю гэту абстаноўку, зразумець сэнс гэтага антысавецкага вою, — а ў гэтым шаленстве ёсць свая логіка і зусім пэўная палітычная падкладка, накіраванасць і мэтаімкнёнасць, — трэба прыглядзецца бліжэй да ўсёй злучнасці падзей, якія разгортваюцца зараз на нашых вачах у сувязі з фінляндскім пытаннем.

БОЛЬШЭВІКІ І ФІНЛЯНДЫЯ

Да Кастрычніцкай рэволюцыі большэвікі мацней, чым якая-б там ні было іншая партыя ў Расіі, былі звязаны з рабочым рухам у Фінляндыі.

У Гельсінгфорсе, Выбаргу, Свеабаргу большэвікі мелі не толькі рабочыя, але і ваенныя арганізацыі сярод рускіх войск. У часе паўстання маракоў у Свеабаргу ў 1906 годзе фінская чырвоная гвардыя дапамагала рускім маракам.

У снежні 1905 года большэвікі ў Тамерфорсе склікалі сваю канферэнцыю. Пазней, у лістападзе 1906 года, тут адбылася першая канферэнцыя ваенных і баявых арганізацый нашай партыі. У Гельсінгфорсе ў ліпені і лістападзе 1907 года сабраліся ўсерасійскія канферэнцыі РСДРП. У 1906—1907 гг. у друкарні фінскай рабочай газеты «Тюэ» («Праца») друкаваўся большэвіцкі «Пролетарый». Праз Фінляндыю пры дапамозе фінскіх рабочых мы накіроўвалі ў часы царызма літаратуру і зброю. Там-жа скрываліся і знаходзіўшыяся ў падполлі большэвікі, уключаючы Леніна. Сувязь з рэволюцыйнымі фінскімі рабочымі ў нас была моцная.

Прыпомнім, што пісаў Ленін у 1909 годзе:

«...Пролетарыят Фінляды ведае, што з першых-жа шагоў сваёй новай барацьбы ён будзе мець на сваім баку соцыялістычны пролетарыят усёй Расіі, гатовы, якія-б ні былі цяжкія ўмовы сучаснага моманту, выканаць свой доўг, увесь свой доўг.

«Якія-б горкія мінуты новая барацьба ні несла настолькі мужнаму фінляндскаму пролетарыяту, новымі ўзамі салідарнасці звяжа яна рабочы клас Фінляндыі і Расіі, падрыхтоўваючы яго да таго моманту, калі ён будзе ў сілах дарабіць тое, што ён пачаў у кастрычніцкія дні 1905 года і што імкнуўся прадаўжаць у слаўныя дні Краншта і Свеабарга» (Ленін, том XIV, стар. 184—185).

Большэвікі, няўстанна змагаючыся супроць царызма, патрабавалі незалежнасці Фінляндыі. Большэвікі рашуча выступалі ў 1917 годзе супроць імперыялістычнай палітыкі Мілюкова і Керэнскага ў адносінах да Фінляндыі. Да-рэчы, гэтыя-ж Керэнскі і Мілюкоў мечуць цяпер громы і маланкі супроць нас за тое, што мы крыўдзім манергеймаў і каяндэраў.

У перыяд ад Лютаўскай да Кастрычніцкай рэволюцыі салдаты і матросы размешчаныя ў Выбаргу, Гельсінгфорсе і другіх гарадах Фінляндыі, у брацкім саюзе з фінляндскімі рабочымі змагаліся супроць урада Керэнскага, у той час як фінская буржуазія біла рускіх салдат і матросаў, рысуючы нашых рэволюцыйных маракоў як бандытаў, крымінальных злачынцаў і г. д.

31 снежня 1917 года прадстаўнік Фінляндыі Свінхувуд атрымаў з рук Леніна пастанову аб прызнанні поўнай незалежнасці Фінляндыі.

Як здарылася, што мы, большэвікі, пайшлі на абвяшчэнне незалежнасці Фінляндыі, ведаючы, што гэта скарыстаюць перш за ўсё фінскія эксплаататары? Гэта аб'ясніў у сваім дакладзе на пасяджэнні ЦВК 22 снежня 1917 года таварыш Сталін.

«...Калі мы больш уважліва ўглядземся ў карціну заваявання Фінляндыяй незалежнасці, — сказаў таварыш Сталін, — то мы ў першую чаргу пераканаемся, што фактычна Совет народных камісараў даў свабоду нявольна не народу, не прадстаўнікам пролетарыята Фінляндыі, а фінляндскай буржуазіі, якая дзіўным сцячэннем акалічнасцей атрымала незалежнасць з рук соцыялістаў Расіі. Фінскія рабочыя і соцыял - дэмакраты апынуліся ў такім становішчы, што павінны былі прымаць свабоду не непасрэдна з рук соцыялістаў, а пры дапамозе фінскай буржуазіі і, бачучы ў гэтым трагедыю фінскага пролетарыята, мы не можам не адзначыць, што фінскія соцыял - дэмакраты толькі з-за нерашучасці і незразумелай трусасці не прадпрымалі рашучых шагоў да таго, каб самім вырваць з рук пануючай буржуазіі сваю незалежнасць.

Можна лаяць Совет народных камісараў, можна да яго крытычна і рэзка адмоўна адносіцца, але няма нікога, хто-б назваў яго фразерамі, не выконваючымі сваіх абяцанняў, бо няма на свеце той сілы, якая прымусіла-б адмовіцца Совет народных камісараў ад сваіх абяцанняў. Гэта мы даказалі тым фактам, што зусім бесстаронна аднесліся да патрабаванняў нават буржуазіі аб прадастаўленні ёй незалежнасці і неадкладна прыступілі да выдання дэкрэта аб самастойнасці Фінляндыі. Няхай-жа свабода Фінляндыі дасць у канцы канцоў поўную незалежнасць рабочых і сялян Фінляндыі і створыць прочную глебу для вечнай дружбы народаў».

(«Известия Центрального Исполнительного Комитета и Петроградского Совета рабочих и солдатских депутатов», № 260 ад 24 снежня 1917 года).

Даведзеныя да крайнасці фінскія пролетарыі паўсталі ў 1918 годзе супроць буржуазіі. Сярод дзесяткаў тысяч забітых манергеймаўскімі палачамі рабочых і сялян налічваецца многа рускіх рабочых, рэволюцыйных маракоў і салдат. Кроў сыноў рускага і фінскага народаў злілася разам, і гэтай кроўю сцэментавана і змацавана сувязь паміж народамі СССР і Фінляндыі.

Калі большэвікі змагаліся за незалежнасць Фінляндыі, калі Ленін уручаў яе прадстаўнікам акт аб незалежнасці, большэвікі ведалі, што на чале Фінляндыі стаяць злейшыя ворагі рабочага класа, паны свінхувуды і К. але мы цвёрда праводзілі нашу праграму — права нацый на самавызначэнне аж да аддзялення. Мы гэта рабілі, мяркуючы, што Фінляндыя не стане плацдармам антысавецкіх інтрыг і змоў. Між тым Фінляндыя ператварылася ў арэну антысавецкіх махінацый.

БЕЛА-ФІНЛЯНДЫЯ — ПЛАЦДАРМ ВАЙНЫ СУПРОЦЬ СССР

Ператварэнне Фінляндыі ў плацдарм вайны супроць СССР ішло за годы 1919 — 1939 па розных лініях.

Англія, Францыя, ЗША, Швецыя ўклалі даволі значныя капіталы ў фінскую прамысловасць, і Фінляндыя эканамічна папала ў падначаленне да англа - амерыканскага капітала. Пры дапамозе ўсіх гэтых «прыяцеляў» Фінляндыя сістэматычна ўзбройвалася: будаваліся лініі абароны (на самай справе — нападу), пабудоўваліся аэрадромы, пасадачныя пляцоўкі ў размерах, якія перавышаюць у дзесяткі разоў патрэбнасці Фінляндыі. Фінляндыя ператваралася ў антысавецкі лагер.

У 1924 годзе ў Фінляндыю прыязджала англійская ваенная камісія на чале з генералам Кіркам. Ваенна-палітычнае абгрунтаванне сваіх прапаноў Кірк даў у Лондане ў дакладзе, зробленым ім па звароце з Хельсінкі 1 красавіка 1925 г. у Ваенна-навуковым таварыстве. Кірк перш за ўсё недвусэнсоўна намякнуў на неабходнасць стварэння англійскай ваенна-марской базы на Аландскіх астравах і затым заявіў, што калі-б Расія прэтэндавала на ваенна-марскія базы ў Фінляндыі, то «зусім праўдападобна аказалася-б столь-жа важным для каго-небудзь другога заперашкодзіць гэтаму. Пагэтаму на самай справе не з'яўляецца праўдападобным, каб Фінляндыя, калі-б яна падверглася нападу, доўга стаяла-б адна».

У красавіку 1925 г. у Фінляндыю прыязджаў англійскі інструктар па арганізацыі паветранага флота з мэтаю яго расшырэння. Паміма гэтага фінляндскі ўрад запрасіў яшчэ некалькі англійскіх інструктароў, у першую чаргу па тэхнічных войсках і па флоту.

У сувязі са сканчэннем работы гэтай камісіі трэба разглядаць і прыбыццё англійскага флота ў Фінляндыю 16 ліпеня 1925 г. у саставе 14 суднаў (5 лёгкіх браніраваных крэйсераў і 9 мінаносцаў з крэйсерам «Кюрасо») на чале з адміралам Келлі.

Фінскія газеты тады вельмі многа шумелі аб «англійскай дружбе». Генерал Кірк зноў прыехаў у Фінляндыю ў красавіку 1939 г. і быў вельмі захоплен арганізацыяй абароны Фінляндыі.

Для таго, каб выкарыстаць Фінляндыю ў антысавецкіх мэтах, неабходна было ператварыць яе ў ваенны лагер. Трэба было стварыць адпаведны нацыяналістычны псіхоз. Адсюль — стварэнне і развіццё арганізацыі шуцкораў, гэтай выдатна ўзброенай і выдатна натрэніраванай фінскай белай гвардыі з усімі яе падсобнымі арганізацыямі для абалваньвання жанчын, дзяцей і т. д., утварэнне нацыяналістычных поўбандыцкіх арганізацый, якія з дня ў дзень цвярдзілі аб стварэнні «вялікай Фінляндыі», аб тым, што неабходна адабраць у СССР не толькі Карэлію, але і наогул ўсе тэрыторыі і населеныя «родственными племенами», г. зн. да Урала; была ўстаноўлена пастаянная сувязь паміж кіруючымі дзеячамі Фінляндыі і Англіі на прадмет каардынацыі ўнутранай і знешняй палітыкі гэтай краіны, быў арганізаван рад правакацый (напад на Карэлію, дыверсійныя акты, перакідка шпіёнаў і дыверсантаў, падкармліванне рускіх белагвардзейцаў і т. д.).

Такім чынам, пад самым Ленінградам склалася асінае гняздо ярых ворагаў Савецкага Саюза і былі створаны ваенна - тэхнічныя прадпасылкі і матэрыяльныя ўмовы для выкарыстання Фінляндыі супроць СССР.

Інакш кажучы, ворагі нашай радзімы звярнуліся да старых планаў часоў 1918 — 1919 гг. — пры дапамозе англійскіх войск і рускіх белагвардзейцаў, пры падтрыманні саюзнікаў захваціць Ленінград, а потым Маскву. Напомнім, што 16 жніўня 1919 г. Англія праз свайго консула ў Выбаргу абяцала Манергейму пазыку ў 6 млн. фунтаў стэрлінгаў пры ўмове паходу на Петраград.

Вядома таксама, што Францыя і Англія вялі ў гэтым сэнсе доўгія перагаворы з Манергеймам, Юдзенічам і генералам Мілерам, а Вільсон, гэты квакер і адвакат, паведаміў фінскім і рускім белагвардзейцам, што ён супроць такой камбінацыі «не супярэчыць».

Мы былі-б недастойны вялікага звання большэвікоў, калі-б не бачылі гэтую вазню ў нашых граніц і не разумелі, што ворагі чакаюць толькі зручнага моманту для таго, каб пусціць у ход антысавецкую машыну.

АНГЛА-ФРАНЦУЗСКІ БЛОК ПРАЛІЧЫЎСЯ

Калі ў Еўропе запахла порахам, англа-французскія падпальшчыкі вайны, надаваўшы ўсім гарантый, пачалі шукаць армію, якая магла-б абараніць іх інтарэсы. Англічане прывыклі чужою кроўю заваёўваць новыя і захоўваць старыя пазіцыі і яны меркавалі, што дастаткова ім выразіць сардэчнае пажаданне выкарыстаць сілы Чырвонай Арміі, як Савецкі ўрад адкажа: «Да вашых паслуг».

Але вышла далёка не так, як аб гэтым марылі ў Лондане і Парыжы СССР — не царская Расія. Мы маем свае ўласныя мэты і задачы. Мы гатовы ісці побач з любым спадарожнікам, калі ён толькі ідзе ў тым напрамку, у якім нам патрэбна. І мы гатовы развітацца з любым партнёрам, калі ён цягне нас у бок ад нашай дарогі. Спробы англа - французскіх імперыялістаў выкарыстаць СССР у сваіх рэакцыйных мэтах скончыліся, як вядома, крахам.

Заключэнне пакта аб ненападзе паміж СССР і Германіяй, а затым дагавора аб дружбе, вызваленне ад польскіх паноў Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі прывялі ў шаленства англа - французаў і падтрымліваючых іх амерыканцаў, якія пераканаліся, што большэвікі не належаць да тых наіўных палітыкаў, якіх можна выкарыстаць шляхам лесці ці туманных абяцанняў.

Дагаворы аб узаемадапамозе паміж СССР і Эстоніяй, Латвіяй і Літвой зноў паслужылі поваадам для шалёнай і нястрыманай агітацыі супроць СССР, прычым уся агітацыя будавалася на тым, што, моў, адбудзецца саветызацыя Прыбалтыкі. Паны імперыялісты ў сувязі з гэтым разрысоўвалі такія «страсці - мардасці», што ім самім зрабілася страшна.

Гэта кампанія мела сваёю мэтаю выклікаць супраціўленне супроць дагавора аб дружбе не толькі буйнай, але сярэдняй і дробнай буржуазіі Эстоніі, Латвіі і Літвы, запалохаць Германію савецкай экспансіяй, саветызацыяй Усхода Еўропы і ўсіх пагранічных з Савецкім Саюзам краін і ўбіць клін паміж Германіяй і СССР.

Перагаворы паміж СССР і фінскім урадам па пытанню аб бяспечнасці Ленінграда выклікалі нябачаны ўзрыў антысавецкай хлусні і ярасных абвінавачанняў. Англія, Францыя, Амерыка адкрыта падбухторвалі фінаў не ісці ні на якія ўступкі. У часе перагавораў з СССР Фінляндыя лёгка і хутка атрымала пазыку ў Злучаных Штатах у размеры 10.000,000 долараў. У Англіі фінам была абяцана зброя ў любой колькасці; былы шведскі міністр замежных спраў Сандлер абяцаў фінам ваенную дапамогу; французы, нарвежцы і італьянцы абяцалі ім маральнае спачуванне і матэрыяльную дапамогу. Зразумела, за іх кошт. Пад уплывам гэтых падбухторванняў і абяцанняў эркo, каяндэры і танеры адмовіліся пайсці на разумныя прапановы, зробленыя Савецкім Саюзам.

Урад Эрко — Каяндэра — Танера не толькі адмовіўся пайсці на прапановы Савецкага Саюза, але фінскія белабандыты адкрылі серыю правакацый на савецкай граніцы, што адразу выкрыла замыслы англа-французскіх імперыялістаў і іх фінскіх падручных.

Савецкі ўрад дэнансіраваў пакт аб ненападзе і заключыў дагавор аб узаемадапамозе і дружбе з дэмакратычным урадам Отто Куусінена. Стварэнне ўрада Куусінена і дагавор аб дружбе з ім выклікалі такую хвалю антысавецкай свістапляскі, якую можна параўнаць толькі з тым, што адбывалася пасля Кастрычніцкай рэволюцыі. Пачалося тое, што ў медыцыне вядома пад іменем «дэлірыум трэменс» (белая гарачка). Пачалася новая паласа ва ўзаемаадносінах паміж СССР і Англіяй, Францыяй, Злучанымі Штатамі і другімі капіталістычнымі краінамі, пачалася новая старонка ўсясветнай гісторыі.

ЛІНІЯ МАНЕРГЕЙМА — РУЦІ — ТАНЕРА

Ужо першыя сутычкі паказалі, што фінская буржуазія стварыла велізарную для Фінляндыі армію, пабудавала пры дапамозе імперыялістычных дзяржаў складаную сетку ўмацаванняў і запаслася значнай колькасцю сучаснай зброі. Буржуазныя газеты называюць фінляндскую лінію ўмацаванняў лініяй Мажыно, лініяй Зігфрыда ці лініяй Манергейма. Што прадстаўляе сабою гэта лінія ўмацаванняў? Вось апісанне гэтых ўмацаванняў, узятае з аднаго амерыканскага журнала.

Будаўніцтва ўмацаванняў у Фінляндыі ў асноўным вялося ў трох раёнах: на Карэльскім перашэйку, у раёне Хельсінкі і ў раёне Або. У раёнах Хельсінкі і Або ўстаноўлены берагавыя батарэі, якія абараняюць подступы да даных пунктаў з мора.

На Карэльскім перашэйку створаны дзве паласы ўмацаванняў, перасякаючых яго ад Фінскага заліва да Ладажскага возера, і вузел супраціўлення ў раёне Выбарга.

Першая абарончая паласа размешчана непасрэдна каля граніцы СССР і займае ў глыбіню 5—12 клм. Сістэма ўмацаванняў у ёй прадстаўляе спалучэнне невялікай колькасці доўгачасовых збудаванняў, каля 38 доўгачасовых агнявых точак (ДОТ) з палявымі фартыфікацыйнымі збудаваннямі — бліндажы, акопы, ходы зносін, дротавыя загараджэнні і супроцьтанкавыя перашкоды ў выглядзе равоў, надоўбаў, мін і т. п. Яна прадназначана для часцей прыкрыцця.

Другая абарончая паласа ўмацаванняў найбольш моцная і з'яўляецца галоўнай лініяй супраціўлення. Маючы глыбіню размяшчэння доўгачасовых агнявых точак у 2— 10 клм., паласа ўмацаванняў цягнецца ад Фінскага заліва праз пункты Рэмпецці, Сумма, ст. Лейпясуо, урочышча Муола, Мялкеля, Віркі Ківініемі і далей па паўночнаму берагу возера Сувантоярві, даходзіць да крэпасці Тайпале на беразе Ладажскага возера.

Усяго на даным умацаваным рубяжы ёсць каля 150 доўгачасовых агнявых точак і больш 100 дрэва-земляных агнявых точак, галоўным чынам кулямётных. ДОТ абнесены дротавымі загародамі і супроцьтанкавымі перашкодамі ў выглядзе равоў, эскарпаў, надоўбаў з каменя і т. п.

Вузел супраціўлення ў раёне Выбарга складаецца з сухапутнага ўмацаванага рубяжа ў раёне ст. Сяйніе— вёска Алясяйніе і берагавых умацаванняў з супроцьзенітнай абаронай Выбарга. Умацаванні ў раёне ст. Сяйніе — вёска Алясяйніе ўключалі ў сябе 8 ДОТ і палявыя фартыфікацыйныя збудаванні.

Доўгачасовыя агнявыя точкі (ДОТ) у сваёй большасці з'яўляюцца жалезабетоннымі кулямётнымі поўкапанірамі і капанірамі, маючымі абаронную тоўшчу пакрыцця і сцен каля 0,8—1,2 метра; сустракаецца невялікая колькасць ДОТ, маючых абаронную тоўшчу да 1,5 метра ці абаронную тоўшчу з броні.

Наяўнасць вялікай колькасці азёр і лясоў у значнай ступені аблегчыла фінам стварэнне моцнай абароны на Карэльскім перашэйку.

Работы па ўмацаванню Карэльскага перашэйка, пачатыя ў 1922 годзе, к 1939 году ў асноўным ужо былі закончаны. Галоўныя намаганні фінаў у 1939 г. былі накіраваны на стварэнне штучных перашкод, асабліва супроцьтанкавых. Для гэтага вырыты глыбокія воўчыя ямы, закладзены па дарогах міны, укапаны ў зямлю велізарныя каменныя глыбы і т. д.

Бельгійскі генерал Эміль Баду, які прымаў непасрэдны ўдзел у арганізацыі ўмацаванняў на Карэльскім перашэйку, і вярнуўся ў пачатку студзеня 1940 г. у Брусель з Фінляндыі, заявіў ваеннаму аглядальніку «Суар»:

«У сховішчах сучаснага тыпу, пабудаваных на лініі Манергейма, фінскі салдат - наглядальнік неўязвім. Яго нельга бачыць, сам-жа ён страляе праз адтуліну, у якую не могуць папасці снарады. Два буйнакаліберных кулямёты могуць разам з гарматамі суседніх умацаванняў падвергнуць праціўніка абстрэлу з фланга. Усе ўмацаванні лініі Манергейма акружаны густой сеткай дротавых загарод».

Як ужо было ўказана, у маі і чэрвені 1939 г. фінскія ўмацаванні аглядаў генерал англійскай арміі Кірк. У жніўні таго-ж года ўмацаванні аглядаліся ваенным міністрам Швецыі Шэльдом. Гэтыя візіты замежных прадстаўнікоў указваюць на тое, з чыёй дапамогаю і пад чыім кіраўніцтвам узводзіліся ўмацаванні Фінляндыі.

Якая ваенная сіла Фінляндыі? Па дакладных даных, Фінляндыя мабілізавала, уключаючы шуцкораўцаў, 500 тыс. чалавек. Гэта значыць — адзін салдат на сем чалавек насельніцтва. Як вялікі гэты процант, паказвае наступнае параўнанне: калі-б СССР правёў мабілізацыю па гэтай прапорцыі, то ў нас армія складалася-б з 25 мільёнаў чалавек.

Фінскія войскі не толькі ў тэхнічных адносінах добра абучаны і ўзброены, але яны палітычна ўзяты ў жалезныя цiскі арганізацыяй шуцкораў, якая састаіць з адборных белагвардзейцаў.

Што такое шуцкор? Шуцкор — добраахвотная ўзброеная арганізацыя буржуазіі, якая ўзнікла ў перыяд абвастрэння класавай барацьбы як сіла, накіраваная супроць рэволюцыі. Акрамя барацьбы з рэволюцыйным рухам, шуцкор мае і задачу ўмацавання абараназдольнасці краіны, прычым з пераходам арміі на тэрытарыяльную сістэму гэта задача шуцкора была значна расшырана. Шуцкор аказвае паліцыі садзейнічанне ва ўсіх выпадках, калі яе сіл не хапае для барацьбы з рэволюцыйным рухам.

Шуцкор карыстаўся самым шырокім падтрыманнем былога ўрада Фінляндыі. З дзяржаўнага бюджэта на ўтрыманне гэтай арганізацыі расходваліся мільёны марак.

Культурна-асветная работа шуцкора накіравана на распальванне шавіністычных настрояў сярод дробнай буржуазіі горада і вёскі. Арганізуемая ёю прапаганда мае сваёй мэтай прывіць насельніцтву нянавісць да ўсяго рэволюцыйнага, і асабліва да СССР, папулярызіраваць ідэю «вялікай Фінляндыі».

Непасрэднае кіраўніцтва гэтай прапагандай знаходзіцца ў руках спецыяльнага бюро галоўнага штаба шуцкора. На месцах-жа ёю кіруюць найбольш рэакцыйныя элементы — папы і т. д.

Многа ўвагі шуцкор удзяляе падрыхтоўцы моладзі да 17-гадовага ўзросту. Пры шуцкоры ёсць так званыя «юнацкія аддзелы», якія аб'ядноўваюць звыш 30 тысяч маладых людзей. Работу сярод жанчын праводзіць жаночая арганізацыя шуцкора «Лотта-Свярд». Яна вядзе падрыхтоўку кадраў неабходных у часе вайны для абслугоўвання тыла. Усяго ў радах шуцкора каля 200.000 чалавек.

Суровая зіма, снежныя мяцелі, прыродныя ўмовы Фінляндыі, безумоўна, дапамаглі белафінам адцягнуць свой непазбежны канец на нядоўгі тэрмін, і ў сувязі з гэтым самі фіны з дня ў дзень выпускаюць хвастлівыя камюніке аб сваіх мнімых перамогах.

СКАНДЫНАЎСКІЯ КРАІНЫ І БЕЛА-ФІНЛЯНДЫЯ

Англа-французы, якія прывыклі ваяваць чужой кроўю і заграбаць жар чужымі рукамі, усяляк спрабуюць выкарыстаць садружаства шведскай і нарвежскай буржуазіі з фінскай буржуазіяй для таго, каб уцягнуць Швецыю і Нарвегію ў вайну супроць СССР. Справацыраваўшы Фінляндыю, гэтыя-ж самыя падпальшчыкі вайны спрабуюць зараз справацыраваць Швецыю і Нарвегію, абяцаючы ім, зразумела, усякую дапамогу. (Ці не такую, якую яны аказалі ў свой час Польшчы?).

Былы міністр замежных спраў Швецыі Сандлер вельмі многа папрацаваў для таго, каб прымусіць фінскі ўрад не згаджацца на ўмовы СССР. Сандлер абяцаў фінам ваенную дапамогу Швецыі, а калі фіны патрабавалі выканання гэтых абяцанняў, то шведская буржуазія пры ўсёй сваёй ваяўнічасці прымушана была даць адстаўку Сандлеру і перадаць гэтага соцыял-дэмакратычнага ваяку ў архіў.

Зараз Сандлер і былы комуніст, а цяпер рэнегат, Хеглунд узначальваюць актывісцкае крыло шведскай соцыял-дэмакратыі і выкарыстоўваюць цэнтральны орган гэтай партыі «Соцыял-дэмакратэн» для шалёнай кампаніі супроць СССР і агітацыі за інтэрвенцыю.

У Нарвегіі вярхушка буржуазіі і соцыял-дэмакратыя — таксама за ўсякую дапамогу і садзейнічанне белафінам. І тут афіцыяльныя асобы і блізкія да ўрада кругі прымаюць актыўны ўдзел у кампаніі супроць СССР.

Імення ў сувязі з гэтым савецкі ўрад зрабіў 5 і 6 студзеня прадстаўленні шведскаму і нарвежскаму ўрадам па поваду кампаніі супроць СССР, якую, як гаворыцца ў адной з заяў, можна было-б аб'ясніць калі-б Швецыя была ў стане вайны з Савецкім Саюзам ці рыхтавалася да вайны супроць СССР.

Адказы шведскага і нарвежскага ўрадаў былі вельмі ўхлончывыя і коўзкія. Дэкларыруючы аб сваім нейтралітэце, шведскі і нарвежскі ўрады спрабуюць аб'ясніць усю кампанію свабодай друку ў гэтых краінах. Мы ведаем цану свабоды друку ў капіталістычных краінах, і нас гэтыя спасылкі менш за ўсё могуць пераканаць. Аказваецца, што ні шведскі, ні нарвежскі ўрады ніякіх адносін не маюць да вярбоўкі добравольцаў, продажу зброі, транзіта зброі і да ўсёй агітацыі супроць СССР. Абодвы гэтыя адказы былі пабудаваны па прынцыпу: «Я не я і конь не мой». Натуральна, што савецкі ўрад не мог прызнаць здавальняючымі такія адказы. Адно ясна, што прадстаўленні савецкага ўрада Швецыі і Нарвегіі з'яўляюцца вельмі сур'эзнай перасцярогай па адрасу тых, хто, як сказана ў заяве шведскаму ўраду, не аказвае дастатковага супраціўлення тым дзяржавам, якія хочуць уцягнуць Швецыю ў вайну супроць СССР.

Шведскі ўрад паслаў спецыяльную місію ў ЗША для таго, каб заключыць пазыку і закупіць узбраенне. Гэтай пазыкай і ўзбраеннем шведскі ўрад хоча запоўніць той прабел, які ўтварыўся ва ўзбраеннях і бюджэце Швецыі ў сувязі з перапраўкай зброі з Швецыі для белафінаў. Зараз барацьба ў Швецыі абвастрылася. Актывісты патрабуюць безадкладнага ваеннага ўмяшання, урад супроць гэтага, разумеючы ўсю небяспеку для Швецыі гэтай авантуры.

ХТО І ЧАМУ ХОЧА АРГАНІЗАВАЦЬ ВАЙНУ СУПРОЦЬ СССР

Матывы ўзрослай актыўнасці раду дзяржаў супроць СССР траякага роду — ваенна-палітычныя, эканамічныя і класавыя.

Англа-французы ніяк не могуць пераварыць да сучаснага моманту, што паміж СССР і Германіяй ёсць не толькі дагавор аб ненападзе, але і дагавор аб дружбе, што Германія не можа быць хутка задушана, як таго хацелася англа-французам, што Савецкі Саюз вызваліў Заходнюю Украіну і Заходнюю Беларусь ад капіталістаў і памешчыкаў і што Савецкі Саюз вядзе самастойную, незалежную ад англа-французаў палітыку. Англа-французы ніяк не могуць супакоіцца. Як-жа так? Паміж СССР і Германіяй ёсць не толькі дагавор аб ненападзе, але і дагавор аб дружбе. Англа-французы і амерыканцы ніяк не хочуць забыць, што на працягу 20 год яны падрыхтоўвалі Фінляндыю для ўдара супроць СССР, уклалі ў гэтую справу вялікія грошы, і раптам увесь іх план ваеннай інтэрвенцыі разбураецца, як картачны домік. Ёсць ад чаго прысці ў ярасць.

Паміма гэтага буржуазія Англіі, Францыі і ЗША ўклала велізарныя капіталы ў Фінляндыі.

Асноўная галіна гаспадаркі Фінляндыі — распрацоўка лясных багаццяў — сканцэнтравана ў руках заправіл «Фінляндскага аб'еднання лясной прамысловасці» (фабрыкантаў і заводчыкаў Юліна, Розенлева, Солітандэра, Вальдэна і др.). Акцыянерныя таварыствы, якія ўваходзяць у гэта аб'еднанне, пад маскай якога арудуе англійскі капітал, выпусцілі ў 1937 годзе прадукцыі на 8,6 млрд. марак, што склала 96 процантаў усёй лесапапяровай прадукцыі краіны. 50 процантаў усяго фінскага экспарта ў Англію складаюць лесаматэрыялы.

Распрацоўка каштоўнейшых руднікоў Петсамо аддана на 40 год англа-канадскай кампаніі Монд-нікель, якая ўваходзіць у Міжнароднае таварыства нікелевых руднікоў. Капіталаўкладанні таварыства ў гэтым раёне складаюць звыш 7 млн. долараў.

У Фінляндыі з дапамогай англа-амерыканскага капітала (Амстронг-Вікерс, Дзюпон і др.) пачалося будаўніцтва ваенных прадпрыемстваў. З 1937 года пачаў працаваць першы ваенны авіяцыйны завод у Тамерфорсе, у пачатку 1939 года быў пушчан гарматны завод у Івесткюлю (на ліцэнзіях Бофорс); створана сетка рамонтных майстэрань па мантажу і рамонту аўтамабіляў.

Канцэрн «Юнайтэд Вулен Міле компані Лімітэд» валодае ў г. Хювінкя (30 міль на поўнач ад Хельсінкі) буйнейшымі ў Паўночнай Еўропе шарсцянымі фабрыкамі.

Палавіна ўсіх акцый індустрыяльнага іпатэчнага банка, які выдаваў пазыкі прамысловым канцэрнам, была размешчана ў Англіі (капітал банка — 4 млн. фунтаў стэрлінгаў).

Дзве трэці капітала Муніцыпальнага іпатэчнага банка размешчаны таксама ў Англіі.

(Працяг у наступным нумары)

ТЭЛЕГРАМЫ

РАШЭННЕ ФРАНЦУЗСКАГА СЕНАТА АБ МАРСЕЛЬ КАШЭНУ

Разгул тэрору ў «дэмакратычнай Францыі» ўзмацняецца з кожным днём. Сапраўдныя выбраннікі французскага народа, дэпутаты-комуністы пазбаўлены сваіх паўнамоцтваў і адданы военна-палявому суду.

Да апошняга часу ва французскім парламенце аставаўся адзін комуніст — сенатар Марсель Кашэн. Для разбору «справы» Кашэна сенат стварыў спецыяльную камісію, на пасяджэнні якой Марсель Кашэн заявіў: «Я выбран воляй народа і дэлегіраван у сенат для таго, каб прадстаўляць пэўную палітыку. Я астаюся верны свайму мінуламу. Я астаюся на той-жа пазіцыі.»

29 лютага сенат вынес рашэнне аб пазбаўленні Марселя Кашэна сенатарскіх правоў.

ПІСЬМО ФРАНЦУЗСКАЙ КОМПАРТЫІ ТАРЭЗУ

Англійская комуністычная газета «Дэйлі уоркер» паведамляе, што французская компартыя паслала свайму генеральнаму сакратару Тарэзу пісьмо, ў якім яна заяўляе, што астаецца адзінай і больш чым калі-б там ні было поўнай рашучасці да канца працаваць сваю барацьбу за мір, супроць імперыялістычнай вайны. Мы, — гаворыцца ў пісьме, — астаемся непахіснымі на сваіх пастах. Не гледзячы на жорсткія рэпрэсіі, компартыя астаецца згуртаванай і цвёрдай. (ТАСС)

ПРАСЛЕДВАННЕ РАБОЧЫХ ВА ФРАНЦЫІ

Нью-Йорк, 1 сакавіка. (ТАСС). Агенцтва Юнайтэд Прэс паведамляе з Марселя, што там гэтымі днямі абвілася буйная забастоўка на адным ваенным заводзе. Улады жорстка расправіліся з забастоўшчыкамі. Замежныя рабочыя, якія працавалі на прадпрыемствах, арыштаваны і высланы з краіны. Рабочыя французы ваеннаабавязаных узростаў накіраваны на фронт. Група рабочых старэйшых узростаў будзе аддана суду.

ВАЙНА Ў ЗАХОДНЯЙ ЕЎРОПЕ

Парыж, 2 сакавіка. (ТАСС). У афіцыяльным вячэрнім паведамленні за 1 сакавіка адзначаны мясцовыя дзеянні патрулёў. У ранішнім камюніке гаворыцца, што ноч на ўсім фронце прайшла спакойна.

Берлін, 2 сакавіка. (ТАСС). Вярхоўнае камандаванне германскай арміі перадае: „На заходнім фронце ніякіх асаблівых падзей не адбылося“.

Германская авіяцыя рабіла разведчыя палёты над Паўночным морам аж да Оркнейскіх астравоў. Германскія самалёты паспяхова атакавалі англійскія ваенныя караблі і гандлёвыя судны, якія ішлі пад канвоем. Адзін параход адразу затануў, другі загарэўся. Чатыры параходы атрымалі цяжкія пашкоджанні.

Лондан, 2 сакавіка. (ТАСС). Міністэрства авіяцыі паведамляе: „Англійскія самалёты зрабілі рад паспяховых разведак над непрыяцельскай тэрыторыяй. Самалёты праляцелі таксама над Фрызскімі астравамі з мэтай абмежаваць дзейнасць германскіх самалётаў, якія раскідваюць міны. Акрамя таго, самалёты зрабілі палёт над многімі германскімі гарадамі і над партамі Куксхафен і Брунсбутэль у бухце Гельголанд. Нашы самалёты пранікалі таксама ўглыб цэнтральнай Германіі, дасягнуўшы Берліна“.

Лондан, 2 сакавіка. (ТАСС). Агенцтва Рэйтэр паведамляе, што некалькі англійскіх лётчыкаў, якія зрабілі вымушаную пасадку ў Бельгіі і інтэрніраваны, уцяклі і прыбылі ў Англію.

УЭЛЕС ПРЫБЫЎ У БЕРЛІН

Берлін, 1 сакавіка. (ТАСС). Сёння сюды прыбыў Уэлес у суправаджэнні загадчыка еўрапейскім аддзелам дзяржаўнага дэпартамента ЗША Мофата. Сёння-ж Уэлес быў прыняты міністрам замежных спраў Рыбентропам. На прыёме прысутнічаў таксама паверэны ў справах ЗША ў Берліне Керк.

РОСТ БЕСПРАЦОЎЯ Ў ЗША

Нью-Йорк, 1 сакавіка. (ТАСС). Згодна заяве міністра працы ЗША Перкінс з мая мінулага года па студзень гэтага года лік занятых у розных галінах народнай гаспадаркі, за выключэннем сельскай гаспадаркі, паменшыўся на 1.160.000 чалавек. 74 прамысловых прадпрыемствы паведамілі аб скарачэнні рабочай сілы, 80 прадпрыемстваў — аб зніжэнні зарплаты. У студзені з малых раздробных гандлёвых прадпрыемстваў было звонена 600 тысяч чалавек, з розных будоўляў — 200 тысяч і з фабрык — 200 тысяч.

КОРАТКА

Оперны тэатр гор. Кельна (Германія) аднавіў пастаноўку оперы выдатнага рускага кампазітара Мусоргскага „Барыс Гадуноў“. Оперны тэатр гор. Дуісбурга упершыню ставіць оперу Чайкоўскага „Мазепа“.

ВАЙНА НА МОРЫ

Лондан, 2 сакавіка. (ТАСС). Агенцтва Рэйтэр паведамляе, што 29 лютага паблізу заходняга ўзбярэжжа Англіі патоплен англійскі параход „Пірхес“ водазмяшчэннем у 7418 тон. 8 чалавек з каманды загінулі.

У той-жа дзень загінуў з усёй камандай латвійскі параход „Катвальдзіс“ водазмяшчэннем у 3000 тон.

Нью-Йорк, 2 сакавіка. (ТАСС). Як паведамляюць з Гібралтара, загінуўшы 18 лютага іспанскі параход „Бандэрас“ быў патоплен падводнай лодкай, 22 члены экіпажа загінулі.

Па словах прыбыўшых з Кюрасао (Галандская Вест-Індыя) пасажыраў, галандскі эсмінец, які ахоўваў гавань, сочыць за двума германскімі караблямі, што стаяць на якары каля порта. 6 другіх германскіх караблёў, захаваных каля Кюрасао, відавочна, адышлі.

Афіны, 2 сакавіка. (ТАСС). Газеты паведамляюць, што ў сувязі з адмовай маракоў працаваць у ваенных зонах, сярод іх зроблена многа арыштаў. З каманд 14 параходаў 113 чалавек сасланы на астравы Эгейскага мора. У ліку сасланых — капітаны, іх памочнікі і механікі.

Берлін, 2 сакавіка. (ТАСС). Інфармацыйнае бюро перадае, што экіпаж югаслаўскага парахода „Лабуд“, які знаходзіцца ў Порт-Саідзе з грузам індыйскай баваўны, адмовіўся плысці ў Англію.

Берлін, 2 сакавіка. (ТАСС). Інфармацыйнае бюро перадае, што 29 лютага германская авіяцыя зрабіла рад налётаў на англійскія ваенныя караблі, якія канваіравалі караван гандлёвых суднаў, і на ўзброеныя гандлёвыя параходы праціўніка. Некалькі суднаў патоплена.

У ПАРЫЖСКІМ РЭСТАРАНЕ



— Глядзіце! Мая фабрыка ў Львове пачала даваць удвая больш прадукцыі.
— А мая ў Беластоку — утрая!
— Эй, паны афіцыянты, не швэндайце без справы...

(Фота-клішэ ТАСС).

ТЭАТР

„ГЕНКОНСУЛ“

2-і Дзяржаўны Беларускі драматычны тэатр паказаў нам сваю другую пастаноўку „Генконсул“—п'есу братоў Тур і Л. Шэйніна.

Сур'ёзныя недахопы гэтай п'есы ўсім вядомы. Занадта ўжо спрошчаны ў ёй абстаноўка і ўмовы барацьбы з ворагам, які, у сапраўднасці, значна больш хітры, разумны, каварны і подлы, чым гэта здаецца аўтарам п'есы. І калі 2-і Беларускі тэатр усё-ж узяўся за пастаноўку „Генконсула“, то, здаецца нам, зрабіў ён гэта толькі таму, што ў яго распараджэнні не было крыху лепшага матэрыялу.

Накіраваная ў сваіх асноўах п'еса „Генконсул“ усё-ж прысвечана вялікай тэме патрыятызма—тэме, міма якой не можа прайсці спакойна ні адзін савецкі тэатр.

Паглядзім-жа, што зрабіў тэатр з гэтай п'есай. Ці ўдалося яму змякчыць яе недахопы? Для таго, каб адказаць на гэта пытанне, трэба адмовіцца ад разбору спектакля ў цэлым, а закрануць толькі асобныя яго эпізоды. Нам здаецца, што цэнтральны эпізод у п'есе — гэта сцэна ў турэмнай камеры. Па сутнасці, галоўнай дзеючай асобай п'есы з'яўляецца малодшы камандзір Гогідзе. Гэту ролю выконвае артыст А. Г. Шэлег. Ён грае тэмпераментна, горача, але занадта ўжо рэзка. Занадта парывісты, неўрастэнічны яго Гогідзе. Усё навокал так напалена, напружана, драматычна, што Гогідзе—Шэлегу абсалютна няма патрэбы яшчэ больш узгубляць вастрыню абстаноўкі. Патрэбен больш плаўны, пластычны Гогідзе.

Гэтыя-ж недахопы, у вядомай ступені, цэрпіць ігра П. І. Іванова, які выконвае ролю байца - пагранічніка Жукава. Ён таксама „пераігрывае“ — занадта мітусіцца і спяшаецца. Сапраўдны гераізм часта хаваецца за спакойным, непаспешлівым крокам, за сарамлівасцю, за скромнасцю. І ў гэтым сэнсе абодва артысты маглі „выправіць“ п'есу.

На жаль гэтага не зроблена. Цяжкую задачу ўзяў на сябе артыст С. А. Казлоў, які ірае бегалвардзейца Княжніцкага. Нам здаецца, што гэта роля патрабуе значна больш глыбокага пераўвасаблення, чым мы гэта бачым у Казлова.

З астатніх ролей неабходна адзначыць ролю губернатара Міама, якую выконвае заслужаны артыст БССР Ц. Н. Сяргейчык. Гэта — складаная роля. Тут патрабуецца ігра тонкая, разумная, якая ўлічвае псіхалогію чужую і не заўсёды зразумелую для еўрапейца. Канстатуем, што Міама атрымаўся ў Ц. Н. Сяргейчыка жыццёвым і, у нейкай меры, тыповым.

Сіма, жонка каменданта консульства, ролю якой іграе артыстка М. С. Бялінская, —гэта, сапраўды, Сіма, скромная і добрая савецкая падруга, якіх многа. Не віна М. С. Бялінскай, што аўтары п'есы зрабілі Сіму такой, што яна мітусіцца „панікёрствуе“. Артыстка выконвае сваю ролю без асаблівага „неўрастэнічнага“ націску, якога і без таго многа ў п'есе.

Заслужаны артыст БССР Н. П. Звездачотаў зрабіў усё магчымае, каб ратаваць ад хадульнасці і схематызма выконваемую ім ролю генеральнага консула СССР.

Ці не здаецца пастаноўшчыку (П. Іванову), што ўся п'еса ідзе ў яго ў занадта хуткім, кінематаграфічным тэмпе? Бо ў жыцці-ж падобныя гісторыі праліквацюць зусім не так імкліва. Вінавата ў многім п'еса. Але, усё-такі, тэатр мог некалькі больш, чым гэта зроблена, згладзіць яе недахопы.

У заключэнне адзначаем добрае афармленне спектакля. Дэкарацыі мастака З. М. Сірвінта выкананы з вялікім густам.

І. Паўлаў.

СУД

Народны суд Сакольскага раёна разгледзеў справу гандляра Мідлера Нохіма Айзікавіча. Устаноўлена, што Мідлер 29 снежня 1939 года закрыў свой магазін і патэнта на 1940 год не аплаціў, тавар-жа схаваў на сваёй кватэры, адкуль прадаваў яго па спекулятыўных цэнах.

Суд прыгаварыў Мідлера да пазбаўлення волі ў аддаленых месцах тэрмінам на пяць год і да пазбаўлення выбарчых правоў, пасля адбыцця кары, тэрмінам на тры годы.

Адказны рэдактар **Б. М. ЗЕЛЬМАНАЎ.**

ОБЯЗАТЕЛЬНОЕ ПОСТАНОВЛЕНИЕ
Городского исполнительного комитета гор. Белостока

от 29 февраля 1940 г. гор. Белосток.

О привлечении городского, частного, и государственного гужевого, ломового, легкового и автотранспорта, находящегося на территории гор. Белостока, для вывозки снега и льда.

В целях предотвращения наводнения, могущего принести ряд бедствий населению города, Городской Исполнительный Комитет гор. Белостока ПОСТАНОВЛЯЕТ:

1. Мобилизовать с 3. III. по 6. III. 1940 г. весь городской государственный и частный ломовой, легковой, гужевой автотранспорт на вывозку снега и льда из города.
2. Установить место сбора частного гужевого, ломового и легкого транспорта по ул. Карла Маркса, 11, к 9 часам утра (по моск. времени) трест очистки города.
3. Весь городской частный гужевой и легковой транспорт прикрепляется к тресту очистки и производит вывозку снега и льда по его указанию (трест очистки производит точный учет прибывающего частного транспорта).
4. Авто - гужтранспорт, принадлежащий государственным предприятиям и учреждениям, производит вывозку снега и льда по указанию городской комиссии по борьбе с наводнением.
5. Виновные в нарушении обязательного постановления подвергаются административному взысканию — штрафу до 100 руб. или принудительным работам до 14 дней.
6. Надзор за выполнением этого постановления возлагается на РК Милиции.

Председатель Городского Исполнительного Комитета гор. Белостока
СЕНКЕВИЧ

Отв. Секретарь Городского Исполнительного Комитета гор. Белостока
ОКУНЬ

Адрас рэдакцыі і выдавецтва: г. Беласток, будынак Аблвыканкома. Тэлефоны рэдакцыі: адказнога рэдактара—22; партаддзела і сакратарыята—23; сельскагаспадарчага, культурнага, літаратуры і мастацтва, школьнага і інфармацыйнага аддзелаў—17.62 выдавецтва і аддзел аб'яў—16-10; друкарня і начная рэдакцыя 5.21. Падпіску на газету прымае Саюздрук тэл. 5.14.

Упаўнаважаны абліта № 262 1-я дзяржаўная друкарня ў г. Беластоку.